# На першым плане

## Эвалюцыя інстытута кіраўніка дзяржавы ў беларускай палітычнай традыцыі ў кантэксце прэзідэнцкіх выбараў

**Галоўнай палітычнай падзеяй бягучага года ў нашай краіне сталі прэзідэнцкія выбары. 11 кастрычніка беларускія грамадзяне абралі Аляксандра Лукашэнку на чарговы тэрмін кіравання краінай. Пры яўцы 87,2 % дзеючага Прэзідэнта падтрымалі 83,5 % выбаршчыкаў. Назіральнікі, як айчынныя, так і замежныя, адзначаюць, што гэтая выбарчая кампанія значна адрознівалася ад папярэдніх і адлюстравала рост палітычнай культуры нашага грамадства. Насычаны передвыбарны перыяд і самі выбары засталіся ўжо ў мінулым, таму наспеў час спакойна паразважаць аб ролі інстытута кіраўніка дзяржавы і яго магчымай эвалюцыі ў Беларусі.**

### Спакон вякоў...

Непасрэдна тэрмін «прэзідэнт» для вызначэння пасады асобы, што кіруе дзяржавай, упершыню ўзнік у Злучаных Штатах падчас Вайны за незалежнасць. Ёсць розныя меркаванні, чаму менавіта гэтае слова, якое паходзіць ад лацінскага «praesidens» – той, хто сядзіць наперадзе, было выбрана бацькамі-заснавальнікамі ЗША. Адны лічаць: так пайшло са старшынёўства Дж. Вашынгтона (ён быў прэзідэнтам) на Філадэльфійскім канвенце 1787 года. Іншыя сцвярджаюць, што Вашынгтона і раней неафіцыйна называлі прэзідэнтам. Ва ўсялякім разе, менавіта з яго асобай звязана наданне старому слову новага значэння. І першапачаткова – з пэўным манархічным адценнем. Удзячныя суграмадзяне збіраліся ўганараваць свайго лідара тытулам «Яго Высокасць Прэзідэнт Злучаных Штатаў і пратэктар іх правоў» *[1, с. 21]*. Аднак сціплы генерал адмовіўся, і ў Канстытуцыі 1787 года ад усёй пышнасці звання засталося толькі – «прэзідэнт».

Так было ў амерыканцаў. Беларуская гісторыя ведае розныя формы інстытута кіраўніка дзяржавы, якія адлюстроўваюць складаны шлях развіцця айчыннай дзяржаўнасці. Варта падкрэсліць, што змена такіх форм ішла скачкамі, пераважна без якой-небудзь непасрэднай пераемнасці.

Княжацкая ўлада ўзнікла ва ўсходніх славян як форма кіравання, што давала магчымасць аб'ядноўваць розныя групы людзей, спачатку ў межах аднаго роду, потым – племені, саюза плямён. Ужо ў IX стагоддзі ў нашых продкаў з'яўляюцца ўсе прыкметы дзяржаўнасці. Пераход ад першабытнай дэмакратыі з яе правадырамі да паўнавартаснай дзяржавы адбываўся праз ваенныя дзеянні, бо менавіта там праяўляліся здольнасці будучых кіраўнікоў. Вайна давала і багацце, якое потым трэба было размяркоўваць у залежнасці ад заслуг таго ці іншага дружынніка.

Пастаянныя баявыя дзеянні, неабходнасць перманентнай падрыхтоўкі да іх вымушалі ператвараць інстытут ваенных правадыроў з часовага ў рэгулярны. Беларускі даследчык С. Цемушаў вылучыў пяць крыніц маёмаснага падтрымання ўлады князёў і адданай ім дружыны: 1) захоп здабычы падчас паходаў, 2) спагнанне кантрыбуцый і водкупаў з суседніх плямён і дзяржаў (даніна), 3) продаж палонных рабоў, 4) унутрыплемянныя, спачатку добраахвотныя, подаці членаў племені князю, 5) судовыя зборы князя («продажы») *[2, с. 13]*. Гэты пункт гледжання абапіраецца на значную гістарычную традыцыю. Дастаткова сказаць, што блізкую пазіцыю па гэтым пытанні займаў і вядомы расійскі гісторык А. Праснякоў *[3, с. 78–79]*.

Утварэнне буйных княстваў на нашых землях прывяло да пашырэння функцый улады, а значыць, і да змены ролі князя ў грамадстве. Ён ператвараецца з ваенна-племяннога правадыра ў сапраўднага кіраўніка дзяржавы. Адначасова расце ўплыў гарадскога веча – агульнага сходу вольнага мужчынскага насельніцтва. Такім чынам, можна гаварыць аб узнікненні новага тыпу палітычнага лідара – вечавога князя. Выдатны савецкі гісторык Б. Грэкаў так характарызаваў становішча князя ў грамадстве: «Ён – прызнаны кіраўнік дзяржавы. Але гэта не самаўладца. Ён прадстаўнік кіруючай эліты, якая прызнае над сабой уладу вялікага князя ў сваіх уласных інтарэсах, падзяляе з ім уладу» *[4, с. 381–382]*. Можна сказаць, што ў Сярэднія вякі сфарміраваўся вельмі цікавы феномен старажытнарускай дэмакратыі, якая спалучалася з пэўнымі аўтарытарнымі рысамі манархічнага ладу.

Вядомы айчынны даследчык даўніны У. Пічэта лічыў, што парадак ва ўладзе трымаўся дзякуючы ўзаемадзеянню трох сіл: веча, князя і княжацкай думы, а пытанні вырашаліся пасля «совета с люди» *[5, с. 22]*. Так, палітычная сістэма Старажытнай Русі знаходзілася на вельмі высокім узроўні. Інтарэсы розных груповак і сацыяльных слаёў балансаваліся праз просты і разам з тым эфектыўны механізм узаемадзеяння ўнутры ўлады.

Феадальная раздробленасць, мангольскае нашэсце, наступ крыжакоў значна паслабілі княствы Заходняй Русі. У гэтых умовах літоўскія правадыры, якія раней узначальвалі асобныя набегі, паступова замацоўваюцца ў рускіх гарадах у якасці князёў. Самы вядомы прыклад – княжанне Міндоўга ў Навагародку, якое лічыцца даследчыкамі пачаткам існавання Вялікага Княства Літоўскага.

Наўрад ці ў нас дастаткова аргументаў, каб сцвярджаць, што літоўскія князі сталі непасрэднымі пераемнікамі княжацкай традыцыі Старажытнай Русі. Па сваіх функцыях яны былі ваеннымі правадырамі плямён (кунігасамі), знаходзіліся на тым узроўні адносін улады і грамадства, які рускія землі прайшлі яшчэ за некалькі стагоддзяў да таго. Улічваючы, што тады панаваў прынцып «новины не велим уводити, а старины рухати», можна сказаць, што ў рускіх гарадах улада літоўскіх князёў часта была намінальнай. А такія цэнтры, як Полацк, Віцебск, увогуле захоўвалі сваю аўтаномію, працягваючы традыцыі старажытнарускай дэмакратыі.

Сітуацыя пачала мяняцца ў часы кіравання Вітаўта, які стаў значна абмяжоўваць мясцовую аўтаномію. Гэта быў цалкам натуральны працэс умацавання цэнтральнай улады, праз які праходзілі ўсе еўрапейскія краіны позняга Сярэднявечча. Аднак заключаная унія з Польскім каралеўствам прынесла новыя тэндэнцыі ў арганізацыю дзяржаўнай улады.

Пад уздзеяннем польскай палітычнай традыцыі ўсё большы ўплыў атрымлівала шляхта, асабліва яе верхні слой – магнаты. Накладвала адбітак і тое, што з часоў княжання Казіміра Ягелона амаль усе вялікія князі літоўскія адначасова былі і каралямі польскімі, жылі пераважна на тэрыторыі менавіта Польшчы, што мяняла і адносіны да асобы гаспадара ў ВКЛ. Ужо ў 1401 годзе з'яўляецца вальны сойм, які паступова абмяжоўвае ўладу вялікага князя *[5, с. 34]*. У адрозненне ад старажытнарускага веча, гэта быў выключна шляхецкі орган.

У Статуце ВКЛ 1588 года былі часткова прапісаны паўнамоцтвы вялікага князя. Сам Статут адкрываецца раздзелам «О персоне нашой господарьской», у якім прадугледжваецца жорсткае пакаранне за абразу і непадпарадкаванне вялікаму князю. Але ў сваім звароце да саслоўяў ВКЛ з нагоды прыняцця Статута падканцлер Л. Сапега піша пра абмежаванні ўлады гаспадара: «Бо не толко сусед а сполный нашъ обыватель в отчизне, але и сам господарь, пан нашъ, жадное звирхности над нами заживати не может, одно толко, колко ему право допущает» *[6, с. 554]*. Такія розныя падыходы адлюстроўваюць дзве ўстойлівыя тэндэнцыі: з аднаго боку, імкненне манарха абараніць сваю ўладу і нават пашырыць свае паўнамоцтвы, з другога – упартасць набілітэту ў адстойванні сваіх правоў.

Па аб'ектыўных прычынах перамога дасталася магнатам і шляхце. Сучасныя беларускія гісторыкі справядліва заўважаюць: «Паколькі вялікія князі літоўскія амаль заўсёды з'яўляліся і каралямі польскімі, у сваю адсутнасць яны часта перадавалі панам-радзе ўсю вярхоўную ўладу» *[7, с. 70]*.

ВКЛ ператварылася ў алігархічную дзяржаву, якая не магла адэкватна супрацьста-

яць знешнім выклікам і трапляла ва ўсё большую залежнасць ад Польшчы. ВКЛ не зведала жахаў, якімі суправаджаўся абсалютызм, але яно патанула ў кашмары неабмежаванага свавольства асобных магнатаў, што развальвала Княства.

Беларускі даследчык В. Галубовіч прааналізаваў развіццё інстытута манарха ў ВКЛ і прыйшоў да высновы аб яго сур'ёзнай дэфармацыі пасля стварэння Рэчы Паспалітай: ад успрыняцця гаспадара як ключавой фігуры ўсяго палітычнага жыцця да чалавека, якому сойм забараняў пакідаць тэрыторыю Рэчы Паспалітай без яго згоды *[8, с. 27–28]*.

Працэс гэты па часе супаў з татальнай паланізацыяй шляхецкага саслоўя. Паказальна, што ў прывілеі Жыгімонта III аб наданні Льву Сапегу права выдаваць Статут 1588 года гаспадар, спачатку назваўшыся ўсімі сваімі тытуламі, потым узгадвае пра былыя статуты ВКЛ, «якія былі складзены па даручэнні нашых святлейшых папярэднікаў каралёў Польшчы», без упамінання вялікага князя *[6, с. 551]*. Сам Л. Сапега ў звароце да Жыгімонта III ад 1 снежня 1588 года таксама, спачатку прапісаўшы поўны тытул, далей гаворыць толькі пра «каралеўскую міласць» і падпісваецца «Вашое королевъское милости пана, пана моего милостивого, найнизъший слуга и верный подъданый Левъ Сапега» *[6, с. 552–553]*.

Пасля ўваходу беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі сітуацыя рэзка мяняецца. У гэтай магутнай дзяржаве панавала абсалютная цэнтралізаваная ўлада манарха. Больш за тое, расійскае самаўладдзе было адным з самых тэарэтычна распрацаваных палітычных рэжымаў. Ідэалагічнае суправаджэнне дзеянняў маскоўскіх манархаў пачалося яшчэ з часоў святога Сергія Радaнежскага. Сапраўдны прарыў быў зроблены пры Іване III, калі ў Маскве ўспрынялі пераемнасць ад Візантыйскай імперыі. Потым узнікла канцэпцыя «Трэцяга Рыма», у 1547 годзе адбылася царская каранацыя Івана Грознага, а ў 1721 годзе Пётр Вялікі абвясціў сябе імператарам. Нарэшце, у 1833 годзе з'явілася знакамітая формула «праваслаўе, самаўладдзе, народнасць».

Адзін з ідэолагаў расійскага манархічнага ладу Л. Ціхаміраў лічыў, што самаўладная манархія не можа існаваць без дзвюх асноў: рэлігійнага ідэала і моцнага, карпаратыўна арганізаванага «сацыяльнага ладу», які мае шчыльную сувязь з вярхоўнай уладай *[9, с. 85]*.

Цікава, што сярод беларускага насельніцтва манархічныя (царысцкія) настроі былі вельмі распаўсюджаныя. Гэтым тлумачыцца і масавая падтрымка сялянствам царскіх улад падчас польскіх паўстанняў. У сялянскіх колах быў складзены цэлы цыкл песень пра добрага, «нашага», «белага» цара *[10, с. 194, 197, 209]*. Нездарма менавіта з Беларусі паходзіць стваральнік надзвычай папулярнай сярод рускіх манархістаў канцэпцыі «Народнай манархіі» І. Саланевіч.

Нават многія польскія патрыёты, ураджэнцы беларускіх зямель, заставаліся манархістамі. Яскравы прыклад – знакаміты праект аднаўлення ВКЛ альбо Польскага каралеўства пад скіпетрам Аляксандра I, складзены ў 1811 годзе М.К. Агінскім *[11, с. 206–209]*.

Тым не менш нельга не заўважыць, што залішняя цэнтралізацыя, канцэнтрацыя аграмаднай улады над велізарнай імперыяй у руках аднаго чалавека зніжала эфектыўнасць кіравання. Гэта стала адной з прычын перманентнага прадукавання рэвалюцыйнай сітуацыі ў краіне і завяршылася звяржэннем манархіі.

Рэвалюцыя 1917 года абрынула ўсю сістэму дзяржаўнай улады. Але чым было яе замяніць? З пачатку XX стагоддзя ў рэвалюцыйна-дэмакратычных колах Расіі вялася гаворка пра магчымасць увядзення ў будучай рэспубліцы пасады прэзідэнта. Аднак развіццё сітуацыі пайшло па зусім іншым сцэнарыі.

Створаная ў 1919 годзе БССР паўтарала спачатку расійскую, а потым агульнасаюзную схему дзяржаўнага будаўніцтва. Яна характарызавалася своеасаблівым дуалізмам. Фармальна, па Канстытуцыі, кіраўніком дзяржавы быў калегіяльны орган: спачатку Цэнтральны выканаўчы камітэт, а з 1937 года – Прэзідыум Вярхоўнага Савета. Гэтыя функцыі былі персаніфікаваны ў асобе старшыні гэтых органаў. Аднак фактычная ўлада належала Камуністычнай партыі на чале з першым сакратаром ЦК. Прычым ва ўмовах аднапартыйнай сістэмы ніхто і не ўтойваў такую падвоенасць, а наадварот, яе падкрэслівалі. Савецкія ідэолагі прызнавалі: «Саветы працуюць у шчыльным кантакце з партыйнымі, камсамольскімі і

прафсаюзнымі арганізацыямі. Залог поспеху ў працы Саветаў – кіраўніцтва імі з боку Камуністычнай партыі» *[12, с. 214]*.

У той жа час прадстаўнікі савецкіх кіруючых колаў добра разумелі ненатуральнасць і супярэчлівасць такога становішча, калі партыя фактычна падмяняла сабой дзяржаўныя органы. З сітуацыі выходзілі праз сумяшчэнне адной асобай партыйных і дзяржаўных паўнамоцтваў. Так рабілася на саюзным узроўні. Часам гэта адбывалася і ў БССР. Па падліках беларускага гісторыка Э. Іофе, Аляксандр Мяснікоў у пачатку 1919 года сумяшчаў усе тры кіруючыя пасады: партыйнага лідара, старшыні ЦВК і старшыні СНК. Гэта адзінкавы выпадак у гісторыі БССР *[13, с. 4]*. Адначасова пасады старшыні ЦВК і СНК пэўны час займаў А. Чарвякоў, а П. Панамарэнка сумяшчаў функцыі першага сакратара ЦК КП(б)Б і кіраўніка ўрада.

Разам з тым у СССР абмяркоўвалася пытанне аб увядзенні пасады прэзідэнта. Упершыню яно паўстала ў 1936 годзе, калі распрацоўваўся праект новай савецкай Канстытуцыі *[14, с. 44–45]*. Аднак І. Сталін, які за два гады да таго фармальна адмовіўся ад пасады Генеральнага сакратара ЦК, не захацеў вылучаць кагосьці індывідуальна ў сферы дзяржаўнага кіравання.

Зноў «прэзідэнцкую» тэму ўзнялі пры распрацоўцы «хрушчоўскай канстытуцыі» ў 1964 годзе. Як вядома, гэты праект так і застаўся нерэалізаваным. Да пытання вярнуліся толькі ў часы перабудовы. Тады яго ўнеслі ў парадак дня Г. Шахназараў і В. Мядзведзеў. Працэс завяршыўся ўстанаўленнем у 1990 годзе пасады прэзідэнта СССР.

## Ва ўмовах незалежнасці

Фарміраванне інстытута прэзідэнцкай улады цесна звязана з развіццём сучаснай беларускай дзяржаўнасці. І тут можна вылучыць некалькі этапаў.

Перыяд 1991–1994 гадоў характарызуецца, з аднаго боку, развалам СССР, а з другога – станаўленнем незалежнай Рэспублікі Беларусь. Трэба асабліва падкрэсліць, што беларускія грамадзяне негатыўна ставіліся да распаду Савецкага Саюза. Гэта пацвердзілі і вынікі рэферэндуму 17 сакавіка 1991 года, на якім большасць жыхароў БССР выказалася за захаванне адзінай краіны. Для эканомікі рэспублікі разбурэнне агульнага савецкага народнагаспадарчага комплексу стала сапраўднай катастрофай. Нарастаў хаос у сістэме дзяржаўнага кіравання, падаў аўтарытэт улады, умацоўваліся нацыянал-радыкальныя групоўкі. Паказальнай стала барацьба за пасаду кіраўніка дзяржавы. Фармальна гэтыя функцыі выконваў старшыня Вярхоўнага Савета. Аднак рэальная ўлада ўсё больш засяроджвалася ў руках прэм'ер-міністра. Разам з тым дэпутаты Вярхоўнага Савета мелі амаль бескантрольную ўладу. Таму частка з іх, што групавалася вакол фракцыі БНФ, рабіла ўсё, каб не даць стварыць моцны ўладны цэнтр вакол пасады Прэзідэнта.

Усё ж большасць дэпутатаў Вярхоўнага Савета выступіла за ўнясенне ў Канстытуцыю 1994 года палажэнняў пра шырокія паўнамоцтвы Прэзідэнта, хоць і абмежаваныя парламентам. Многія прадстаўнікі бюракратыі і дырэктарскага корпуса тады меркавалі, што кіраўніком беларускай дзяржавы стане В. Кебіч.

Менавіта прыняцце Канстытуцыі і выбары Прэзідэнта адкрываюць новы этап гісторыі сучаснай Беларусі. У выніку напружанай палітычнай барацьбы тады перамог Аляксандр Лукашэнка, малады амбіцыйны лідар, які стаў вядомы грамадству дзякуючы сваёй антыкарупцыйнай дзейнасці.

Перамога А. Лукашэнкі на выбарах 1994 года стала лёсавызначальнай для Беларусі. З гэтага часу ўсе значныя падзеі ў краіне звязаны непасрэдна з дзейнасцю кіраўніка дзяржавы. Шмат у чым першыя два гады яго знаходжання ва ўладзе сталі часам выбару далейшага шляху развіцця Беларусі. На гэты перыяд прыпадае рэферэндум 14 мая 1995 года, па выніках якога была зацверджана дзяржаўная сімволіка, абвешчана раўнапраўе беларускай і рускай моў, узяты курс на інтэграцыю з Расіяй, а Прэзідэнт атрымаў права датэрмінова спыняць паўнамоцтвы Вярхоўнага Савета.

Востры палітычны крызіс, абумоўлены як супярэчнасцямі ў Канстытуцыі, так і непрыняццем часткай палітычных сіл курсу Прэзідэнта А. Лукашэнкі, быў урэгуляваны мірным шляхам – праз рэферэндум 24 лістапада 1996 года. На ім грамадзяне поўнасцю падтрымалі пазіцыю кіраўніка дзяржавы і зацвердзілі новую рэдакцыю Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Наступны этап гісторыі суверэннай Беларусі – з 1996 па 2001 год – характарызаваўся інтэнсіфікацыяй эканамічных працэсаў, актывізацыяй інтэграцыйных сувязей з Расіяй. Адначасова была створана вертыкаль дзяржаўнага кіравання. Старыя палітычныя партыі імкліва трацілі ўплыў у грамадстве. Афармілася жорсткае супрацьстаянне Прэзідэнта і пазасістэмнай палітычнай апазіцыі. У гэты час заходнія дзяржавы (краіны Еўрасаюза і ЗША) ажыццяўлялі націск на Беларусь з мэтай змянення яе палітычнага курсу.

У 2001–2010 гадах беларускія грамадзяне пачалі адчуваць вынікі напружанай працы. Беларусь выйшла ў лідары сярод еўрапейскіх краін па дынаміцы развіцця. Палітычны лад даказаў сваю стабільнасць і жыццяздольнасць, у выніку ў нашай краіне не ўдалося ажыццявіць сцэнарый «каляровай рэвалюцыі», рэалізаваны ў некалькіх постсавецкіх дзяржавах. Пасля 2006 года назіраецца пэўная лібералізацыя палітычных працэсаў унутры краіны і пацяпленне адносін з Захадам.

Новы перыяд развіцця Беларусі, які пачаўся пасля выбараў 2010 года, працягваецца і зараз. У эканамічным плане ён азнаменаваўся ўзмацненнем уплыву на Беларусь адмоўных наступстваў сусветнага эканамічнага крызісу. Тым не менш дзяржава захавала высокі ўзровень сацыяльных гарантый для насельніцтва. У палітычнай сферы адбываецца паступовы пераход ад канфрантацыі да шырокага грамадскага дыялога. На міжнароднай арэне ў сувязі з вынікамі прэзідэнцкіх выбараў 2010 года, якія не задаволілі кіраўніцтва ЕС і ЗША, спачатку адзначалася рэзкае пагаршэнне адносін з краінамі Захаду, аж да ўвядзення санкцый супраць Беларусі. Разам з тым прадуктыўна развівалася супрацоўніцтва нашай краіны з Расіяй, іншымі краінамі СНД, Кітаем. Пачаў дзейнічаць Еўразійскі эканамічны саюз. Пад Мінскам распачалі ўзвядзенне буйнога кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Міжнародны аўтарытэт Беларусі сур’ёзна ўмацавала міратворчая пазіцыя, занятая нашай дзяржавай ва ўкраінскім крызісе. Мінск стаў пляцоўкай для мірных перамоваў, і на гэтым фоне заўважальна палепшыліся адносіны з краінамі Захаду, пачаўся пошук шляхоў узаемаразумення.

## Беларуская палітычная мадэль

Дык што ж мы ўсё-такі пабудавалі? Тут існуе вялікая колькасць розных стэрэатыпаў. Шмат з іх маюць негатыўны характар і створаны заходняй прапагандай. Яны будуюцца вакол праслаўтай «апошняй дыктатуры Еўропы». Часам тут сустракаюцца відавочныя недарэчнасці. Так, у выпушчаным у Вільнюсе навучальным дапаможніку можна прачытаць літаральна наступнае: «Такім чынам, па паказчыку «роля палітычнай мабілізацыі» наша краіна займае прамежкавае становішча паміж аўтарытарызмам і султанізмам» *[15, с. 102]*. Ствараецца ўражанне, што аўтар няпэўна ўяўляе сабе, пра што ён піша, і імкнецца намаляваць чорнымі фарбамі максімальна негатыўны вобраз беларускай палітычнай сістэмы. Пры гэтым апаненты беларускай улады, крытыкуючы яе за аўтарытарызм, самі не супраць накіраваць аўтарытарныя тэндэнцыі ў карысным для сябе рэчышчы. Так, Я. Раманчук заклікае ўвесці антыбюракратычную дыктатуру ў інтарэсах прыватнага бізнесу: «Каб распрыгоніць дух нацыянальнага прадпрымальніцтва, трэба запрыгоніць нутро нацыянальнай бюракратыі» *[16, с. 303]*.

У сваю чаргу, прыхільнікі айчыннай палітычнай сістэмы неяк занадта асцярожна падыходзяць да яе характарыстыкі. Адсюль і нарадзілася вядомая спрэчка ў паліталогіі: наша краіна прэзідэнцкая ці змешанага тыпу – прэзідэнцка-парламенцкая? Апошняя выснова робіцца на падставе таго, што прэм’ер-міністр, а таксама некаторыя іншыя вышэйшыя службоўцы назначаюцца Прэзідэнтам са згоды альбо Савета Рэспублікі, альбо Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.

Аднак відавочна, што такі падыход супярэчыць фактычнаму становішчу, калі Прэзідэнт з’яўляецца вяршыняй і эпіцэнтрам уладнай вертыкалі. Нават ужо з тэксту арт. 79 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь становіцца зразумелым асаблівае становішча Прэзідэнта. Там прама гаворыцца, што ён з’яўляецца не толькі кіраўніком дзяржавы, але і «ўвасабляе адзінства народа, гарантуе рэалізацыю асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі, прадстаўляе Рэспубліку Беларусь у адносінах

з іншымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі. Прэзідэнт прымае меры па ахове суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе нацыянальнай бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці, забяспечвае палітычную і эканамічную стабільнасць, пераемнасць і ўзаемадзеянне органаў дзяржаўнай улады, ажыццяўляе пасрэдніцтва паміж органамі дзяржаўнай улады» *[17]*.

На самай справе дыскусія вакол паўнамоцтваў Прэзідэнта не выключна беларуская спецыфіка. Яна характэрная для ўсіх былых савецкіх рэспублік (ды і не толькі іх). Напрыклад, прыхільнікі прэзідэнцкай рэспублікі ў Арменіі адзначалі, што парламентарызм ва ўмовах слабасці палітычных партый можа прывесці да безуладдзя, ад якога да дыктатуры адзін крок. На іх погляд, моцная прэзідэнцкая ўлада найбольш спрыяльная для пераходнага перыяду *[18, с. 17]*. Гэтая думка пацвярджаецца палітычнай гісторыяй постсавецкай прасторы. У краінах, якія выбралі для сябе парламенцкую форму кіравання, назіраецца вельмі моцны рух за павелічэнне ролі прэзідэнта і яго ўсенароднае абранне. Гэта пытанне актуальнае для Латвіі. А ў Малдове слабасць прэзідэнцкай улады стала адной з прычын перманентнага палітычнага крызісу.

У сучаснай навуцы існуюць розныя трактоўкі моцнага інстытута прэзідэнцтва. Публічна-прававую характарыстыку яму дае доктар юрыдычных навук Б. Елісееў. Ён вызначае ролю кіраўніка дзяржавы як інтэграцыйнага прававога інстытута, мэта якога ў каардынацыі дзеянняў улады *[19, с. 151]*. Вельмі цікавае вызначэнне, з пункту гледжання народнай ментальнасці, дае прэзідэнцтву прафесар М. Красноў. Паводле яго, інстытут прэзідэнцтва – гэта толькі знешне вынік гістарычнай інерцыі, але ў глыбінным сэнсе ён, як і абсалютная манархія, увасабляе неасэнсаваную рэцэпцыю ідэі «бацькоўства» *[20, с. 33]*.

Адзін з вядучых заходніх палітолагаў Р. Саква лічыць, што інстытут прэзідэнцкай улады ўмацаваўся настолькі, што стаў уплываць на ўсе аспекты грамадскага і палітычнага жыцця краіны і з'яўляецца дамінуючай уладнай структурай у тым сэнсе, што знаходзіцца ў цэнтры ўсёй сістэмы дзяржаўных і палітычных інстытутаў і імкнецца падпарадкаваць іх свайму ўплыву *[21, с. 112]*.

Калі гаварыць пра сучасную палітычную сістэму Беларусі, то ў ёй можна ўбачыць спалучэнне дэмакратычных рыс з умерана аўтарытарнымі. Менавіта выбары – яскравае сведчанне дэмакратыі, бо народ сапраўды з'яўляецца крыніцай улады. Грамадзяне шляхам выбару фарміруюць кіраўніцтва краіны. Але выяўленне дэмакратыі не абмяжоўваецца толькі выбарамі. Формай прамой дэмакратыі ёсць рэферэндумы. Існуе таксама магчымасць выказваць сваё меркаванне на ўсенародных сходах. Акрамя таго, спецыфічнай формай кантролю грамадства над уладай стала работа са зваротамі грамадзян.

Ад аўтарытарызму ў нас – моцная канцэнтрацыя ўлады ў адным інстытуце, менавіта ў руках Прэзідэнта, які абапіраецца на ўстойлівую вертыкаль у розных галінах дзейнасці *[22, с. 5]*. Але і такая мадэль для пераходнага грамадства цалкам зразумелая. Вядомыя амерыканскія палітолагі Г. Алманд і С. Верба пісалі: «Бо хоць і праўда, што кіраўнікі новых краін зачараваныя навукай і тэхнікай, што іх цягне да прагнай да перамен і навізны тэхнакратычнай палітыкі як сродку далучэння да новых даброт і магчымасцей сучаснага свету, яны разам з тым застаюцца прадуктамі сваіх традыцыйных культур і аддалі б перавагу таму, каб асцярожна, мякка працаваць менавіта з гэтымі культурамі, калі б такі выбар быў ім даступны» *[23, с. 18]*.

Беларусам такі выбар аказаўся даступны, і мы вырашылі не развітвацца з традыцыяй, не пераносіць усляпую замежныя інавацыі, а будаваць уласную палітычную мадэль. Дарэчы, такое права замацавана і на міжнародным узроўні. У Дакладзе Праграмы развіцця ААН аб развіцці чалавека за 2002 год «Паглыбленне дэмакратыі ў раз'яднаным свеце» вычарпальна сказана: «Зусім не абавязкова, каб выбраны імі тып дэмакратыі будаваўся па пэўнай мадэлі, напрыклад паўночнаамерыканскай альбо заходнееўрапейскай, мадэль павінна вызначацца мясцовымі ўмовамі і гістарычнымі фактарамі» *[24, с. 61]*.

## Выбарны калейдаскоп

Калі параўнаць сёлетнюю прэзідэнцкую кампанію ў Беларусі з мінулымі, то тут можна зрабіць шэраг цікавых назіранняў. Па-першае, яўка. Беларускія выбаршчыкі

Беларуская Думка




дастаткова актыўна галасуюць. На ўсіх прэзідэнцкіх выбарах сярэдняя яўка склала 81,26 %. Гэта лічба адлюстроўвае высокую адказнасць грамадзян у вызначэнні лёсу краіны.

Цікавы і вынік кандыдата, які перамог. З улікам першага тура выбараў 1994 года ў сярэднім за Аляксандра Лукашэнку аддавалі свае галасы 72,51 % з тых, хто прыйшоў на выбарчыя ўчасткі. І гэта не нейкія спантанныя паводзіны альбо вынік уздзеяння ўлады, як лічаць яе апаненты. Дастаткова паглядзець на вынікі апытанняў грамадскай думкі ў міжэлектаральны перыяд, каб упэўніцца: дзеючы Прэзідэнт Беларусі на працягу ўсіх апошніх гадоў застаецца самым папулярным палітыкам нашай краіны.

Сёлета шмат меркаванняў было наконт колькасці кандыдатаў. Спачатку гадалі, колькі іх будзе, потым абмяркоўвалі: чацвёра прэтэндэнтаў гэта шмат ці дастаткова? Палітычная гісторыя Рэспублікі Беларусь дае багаты набор варыянтаў. У 1994 годзе было зарэгістравана 6 прэтэндэнтаў на вышэйшую пасаду ў дзяржаве, у 2001 – 4 (адзін кандыдат потым зняўся з выбараў за некалькі дзён да галасавання), у 2006 – 4, у 2010 – 10. Пры гэтым з канкурэнтаў А. Лукашэнкі самыя высокія вынікі дэманстравалі: В. Кебіч у першым туры выбараў 1994 года (17,33 %, але ўжо ў другім туры ўзровень яго падтрымкі ўпаў да 14,1 %) і У. Ганчарык, у 2006 годзе ён атрымаў 15,65 % галасоў.

Пакуль толькі на першых прэзідэнцкіх выбарах мелі месца два туры: астатнія праходзілі ў адзін. І гэта зразумела, улічваючы высокі рэйтынг дзеючага Прэзідэнта Беларусі.

Што да тактыкі ўлады, дык яна дэманстравала на выбарах упэўненасць ва ўласных сілах. Кіраўнік дзяржавы настройваў прадстаўнікоў усіх структур, датычных да арганізацыі і правядзення выбараў, на разважную і сумленную працу. Але перасцерагаў ад залішняй самазаспакоенасці і адпачынку на лаўрах. Выбары – гэта найперш экзамен для ўлады, які яна здае народу.

Усе палітычныя аналітыкі не сумняваліся ў перамозе А. Лукашэнкі. Але пры гэтым ніхто, за выключэннем ужо зусім ангажа-

ваных людзей, не зможа назваць гэтыя выбары фармальнымі альбо прахаднымі. Выбарчая кампанія ў Беларусі традыцыйна вызначаецца канкурэнтнай барацьбой, духам спаборнасці. Усе кандыдаты ў прэзідэнты атрымалі магчымасць прадставіць свае праграмы, выказаць самую рэзкую крытыку ў адрас дзеючай улады. Дарэчы, некаторыя рацыянальныя прапановы потым могуць быць выкарыстаны органамі ўлады ў рабоце.

Адзін з самых інтрыгуючых момантаў праведзенай выбарчай кампаніі – гэта міжнародная рэакцыя, тое, ці прызнаюць нашы выбары за мяжой. Расія, краіны СНД, Кітай, Індыя, іншыя нашы саюзнікі аб'ектыўна ацэньваюць сітуацыю і прызнаюць відавочнае. З другога боку, і ЕС, і ЗША, і поўнасцю залежныя ад іх міжнародныя арганізацыі традыцыйна настроены больш чым крытычна да вынікаў выбараў у Беларусі. Прычыны, зразумела, не ў заканадаўстве, не ў працэдуры галасавання, а ў асобе таго кандыдата, які атрымлівае перамогу. Заходнія палітыкі хацелі б мець справу з уласным стаўленікам, паслухмяным і кіруемым. Таму А. Лукашэнка, які праводзіць незалежную палітыку ды яшчэ з'яўляецца ініцыятарам інтэграцыйных працэсаў на постсавецкай прасторы, іх яўна не задавальняе. Але, з другога боку, у апошні год у сувязі з украінскім крызісам і той асаблівай роляй, якую адыгрывае ў яго вырашэнні Беларусь і асабіста А. Лукашэнка, намецілася пацяпленне ў нашых адносінах з Захадам. Аднак у заходніх палітыкаў надзвычай развіта інерцыйнае мысленне. Нават на фоне відавочных працэсаў ім цяжка адмовіцца ад уласных догмаў і міфаў, няхай і відавочна састарэлых, тых, што ўжо не адлюстроўваюць рэчаіснасць. Таму заходнія назіральнікі, хоць і адзначылі некаторы прагрэс у правядзенні кампаніі па выбарах Прэзідэнта Беларусі, засталіся пераважна вельмі крытычнымі.

Кожная значная падзея палітычнага жыцця ўзбагачае грамадства пэўным вопытам ці з'яўленнем новай традыцыі. Не стала выключэннем і праведзеная кампанія. Але гэта прадмет для асобнага аналізу, які яшчэ наперадзе.

**Вадзім ГІГІН,**
**кандыдат гістарычных навук, дацэнт**

## ЛІТАРАТУРА


1. Майлыбаев, Б.А. Институт Президента в Казахстане: монография / Б.А. Майлыбаев. – 2-е изд., доп. – Алматы, 2004.
2. Темушев, С.Н. Генезис и эволюция института верховной власти в славянских раннефеодальных государствах (VII–XII вв.): автореф. дис. … канд. ист. наук / С.Н. Темушев; Бел. гос. ун-т. – Минск, 2003.
3. Пресняков, А.Е. Лекции по русской истории: в 2 т. / А.Е. Пресняков. – М., 1938. – Т. 1: Киевская Русь.
4. Греков, Б. Киевская Русь / Б. Греков. – М., 2004.
5. Пичета, В.И. История белорусского народа / В.И. Пичета. – Минск: Изд. центр БГУ, 2003.
6. Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Т. 3. Дадатак. А – Я / рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) (і інш.). – Мінск, 2010.
7. Беларусь: страницы истории / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории; редсовет: А.А. Ковалени [и др.]. – Минск, 2011.
8. Галубовіч, В. Палітычная сістэма Вялікага Княства Літоўскага ў 1588–1648 г. / В. Галубовіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2010. – № 3. – С. 26–33.
9. Тихомиров, Л.А. Монархическая государственность / Л.А. Тихомиров. – М., 1998.
10. Беларускі эпас / пад рэд. П.Ф. Глебкі, І.В. Гутарава. – Мінск, 1959.
11. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.: у 2 кн. – Кн. 1 / А.А. Каваленя [і інш.]; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2011.
12. Белорусская Советская Социалистическая Республика: энцикл. справ. / редкол.: П.У. Бровка (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1978.
13. Иоффе, Э.Г. От Мясникова до Малофеева. Кто руководил БССР / Э.Г. Иоффе. – Минск, 2008.
14. Паречина, С.Г. Институт президентства: история и современность / С.Г. Паречина / под общ. ред. Е.В. Матусевича. – Минск: ИСПИ, 2003.
15. Роўда, У. Палітычная сістэма Рэспублікі Беларусь: вучэб. дапаможнік / У. Роўда. – Вільня: ЕГУ, 2011.
16. Романчук, Я. Теория и практика провалов государства. К новой политэкономии / Я. Романчук. – Минск, 2013.
17. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (са змяненнямі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскіх рэферэндумах 24 лістапада 1996 г. і 17 кастрычніка 2004 г.) [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://mir.pravo.by/library/section_1/constitution/costitutions/constitution_by/. – Дата доступу: 12.10.2015.
18. Конджакулян, К.М. Исполнительная власть и институт президентства: вопросы соотношения (административно-правовое исследование на примере Российской Федерации и Республики Армения): монография / под ред. Н.М. Чепурновой. – М., 2013.
19. Елисеев, Б.П. Система органов государственной власти в современной России / Б.П. Елисеев. – М., 1997
20. Краснов, М.А. Глава государства: рецепция идеи «отцовства» / М.А. Краснов // Общественные науки и современность. – 2008. – № 6. – С. 27–38.
21. Саква, Р. Институт президентства: либеральный или неопатерналистский политический режим / Р. Саква // Конституционное право: восточноевропейское обозрение. – 2003. – № 4 (45). – С. 112–125.
22. Матусевич, Е.В. Белорусская модель развития: теория и практика / Е.В Матусевич, Н.М. Шевцов, Г.М. Пашковский [и др.]. – Минск: ИСПИ, 2003.
23. Алмонд, Г., Верба, С. Гражданская культура: политические установки и демократия в пяти странах / Г. Алмонд, С. Верба; пер. с англ. Е. Генделя. – М.: Мысль, 2014.
24. Углубление демократии в разобщенном мире: доклад о развитии человека за 2002 год / С. Фукуда-Парр, Н. Вудс, Н. Бэрдсэлл и др.; Организация Объединенных Наций. – Нью-Йорк; Оксфорд: Оксфорд юниверсити пресс, 2002.